Усё-ж такі эміграція у Амэрыку крыху стрымаецца. Хаця высяленьне лепшых, байчэйшых, работнікоў для нашаго краю ня надта карысна, але, калі німа чаго есьці на вёсцы, прыходзіцца хоч-ня-хоч выбірацца у прочкі. Дык куды ж паткнуцца тым грамадам неграматных эмігрантоў, каторым зачыняецца ўезд у Амэрыку?

Апрача высяленьне на даўжэйшы час — напрыклад, на колькі гадоў, ёсць ешчэ высяленьне з вёскі на карацейшы час — на колькі месяцоў. Гэтак з Галічыны (у Аўстрыі) селяне-украінцы, каторым цесна на сваей гаспадарцы, ідуць на летніе работы ў полі у Пруссію (у Немеччыне), дзе на вёсках страшэнне нехватае рабочых рук. Плоцяць ім тамака добра, і яны ўжо з грашыма вертаюцца да хаты. Гэтак сама робяць і польскіе селяне с пагранічных паветоў: паводлуг закону, яны маюць праваісьці на работы за граніцай ня больш, чым на 10 месяцоў, *без пашпартоў*. Цяпер гэты закон пашырэн і на ўсе губэрні, дык за граніцу (с пазваленьня і с паперай ад паліцыі) могуць ісьці на 10 месяцоў селяне з усяе Расеі. І калі закон аб недапушчэньні неграматных перэсяленцоў у Амэрыку ўвойдзе ў жыцьце дык неграматным толькі і астаецца адна дарога: на дзесяцімесячные заробкі у Пруссію.

Ці гэта будзе для нашаго краю карысней, ці не, пакажэ само жыцьцё.

---

## Гутаркі с чытачамі. *)

### Які шрыфт?

Справа аб выбары шрыфту, відаць, моцна ўскалыхнула нашых чытачоў, бо на гэтае пытаньне, каторае ешчэ летась кінула „Н.Н.“, пасыпалося шмат лістоў. Але ешчэ больш пасыпалося, як пачалі мы гэтые лісты друкаваць. Кожын пачаў раіць, кожын рупіўся знайсці „залатую сярэдзіну“, каб задаволіць як прыхільнікоў лацінскаго шрыфту, так і гражданкі. Вось мы і пастанавілі крыху пачэкаць з друкам нашых гутарак, каб усіх пачуць, каб усім даць можнасць высказаць сваю думку, і пасьля ўжо с чыстым сэрцэм прыхінуцца да тых, ці іншых. Гэтак ізноў набралося шмат дужа цікаваго матэр'ялу. Але друкаваць усяго, на жаль, ня прыйдзецца, бо аўторы новых лістоў паўтараюць тое, што ўжо іншые сказалі і што было надрукавана.

Цяпер, калі прайшлі два месяцы з лішкам, як апошні раз надрукавалі мы свае гутаркі, можэмо ўжо зрабіць выбар, які прыняць шрыфт, *бо так, як ёсць, далей быць ня можэ.* Як ні як, а павінна быць інакш.

Справу аб нейкім новым шрыфце павінны мы зусім аткінуць, бо — пры цяперашніх варунках жыцьця — беларусоў не навучыш новых літэр. Завясьці новые літэры — гэта значыць затрымаць беларускае адраджэньне на колькі дзесяткоў год. Гэта разумеюць і самі нашы чытачы, дык аб такім праекце не варта і гукаць.

Цяпер астаецца толькі выбраць адно: або лацініку, або гражданку. Пакуль на гэта атказаць, прыпомнім ешчэ раз, што кажуць прыхільнікі лацінікі і гражданкі, і толькі тады падамо голас за той шрыфт, каторы нам можэ *прынясьці больш карысьці.*

За лацінікай гэткіе аргумэнты:

1) Лацінскі шрыфт пануе бадай усюды паміж культурнымі народамі, і цяпер нават шмат народоў, што маюць свой ўласны шрыфт, пераходзяць на лацініку.

2) Лацінікай лепш і чысьцей можна аддаць асобеннасьці беларускай мовы.

За гражданкай гэткіе:

1) Мы бела-*русы*, а не бела *ляхі*, і наш шрыфт родны — *рускі*.

2) Рускімі літэрамі пісалі нашы слаўные князі часоў нацыональнай незалежнасьці, і гэты шрыфт ужываў урад (правіцельство) Вялікаго Княжства Літоўскаго.

3) Пры цяперашніх школах рускі шрыфт куды больш пашырэны на Беларусі, і цяпер у нас лацінскіх літэр нават іншые інтэлігенты (асабліва праваслаўные) не разумеюць, падчас калі гражданку бадай кожны болей меней вучоны беларус знае.

4) Беларусоў праваслаўных, што знаюць толькі рускіе літэры, у пяць разоў больш, як каталікоў. А як ешчэ настане агульнае навучаньне, то і *усе* будуць умець чытаць на рускіх літэрах а на лацінскіх — толькі жменька каталікоў.

5) Лацінскіе літэры самі па сабе зусім не прыблізяць беларусоў да заходняй культуры, бо культуру ня шрыфт шырыць, а *ідэі і знаёмства чужых моў*.

Вось, здаецца, і ўсе аргумэнты. Ад сябе мы павінны ешчэ дадаць, што за рускі шрыфт падалі куды больш галасоў, як за лацінскі (падавалі голас за рускі шрыфт і багата каталікоў), і што „Наша Ніва“, друкаваная рускімі літэрамі, расходзіццау два разы болей, як друкаваная лацінскімі літэрамі.

Вось цяпер, абмяркаваўшы ўсё акуратна і палажыўшы руку на сэрцы, хай кожны, маючы на мэце карысць сваей Бацькоўшчыны-Беларусі, скажэ, якога шрыфту на далей трымацца. Здаецца што двух атказоў і ня можэ быць. *Трэба далей друкаваць газэту рускімі літэрамі*, бо за тымі літэрамі падае свой голас ня толькі ўся наша мінуўшчына, але ешчэ і практычны бок таго вымагае *Пры цяперашніх варунках рускі шрыфт можэ прынясьці нам найбольш карысьці.*

*На гэта павінны мы усе згадзіцца. Агульная карысць павінна нам быць меркай таго, чаго маем на далей трымацца.*

Апроч таго ешчэ раз звернем увагу нашых чытачоў, што змена шрыфту зусім нічагусенька ня зменіць нашай мовы, нашых думак, нашаго духу. Якімі былі, такімі і астанемся. *Былі беларусамі і будземо далей беларусамі.* Папраўдзі, то яно ўсё роўна, якімі значкамі будзе друкавацца газэта: ці такімі значкамі, што будуць закручэны ў верх, ці ў ніз? Ці, напрыклад, можэ змяніць нашу душу тое, што мы слова „Беларусь“ напішэм рускімі літэрамі — Беларусь, а не лацінскімі — Biełaruś? Нічагусенька! Беларусь ад гэтаго ня зменіцца і на далей астанецца роднай бацькоўшчынай для сьведомых беларусоў, бо *наша справа не ў шрыфце: справа наша ў нашай мове, ў нашай душы.* Калі гэта ўсе захаваем і парупімся развіць, тады мы будзем *культурнай сілай*, тады спакайней можэм глядзець у будучыну.

Ведама, у беларусоў ёсць шмат ворагоў, каторые пастараюцца скарыстаць с таго, калі мы пачнем друкаваць газэту тымі, а не іншымі значкамі, пастараюцца ад нас адарваць несьвядомых беларусоў ды скіраваць іх ешчэ проці нас. Мы акуратна разумеем гэта, разумеем, што цёмных беларусоў ешчэ ёсць болей, чым сьвядомых, і дзеля таго, *пакуль хопіць сіл, будземо выдаваць „Нашу Ніву“ двумя шрыфтамі*, як і дагэтуль, каб да ўсіх дайсьці, каб развіваць любоў да ўсяго роднаго як паміж тымі, што чытаюць лацінскімі літэрамі, так і тымі, што навучыліся рускіх. Будзем шырыць тую святую думку, што беларус, якой бы ён ня быў веры, акімі бы літэрамі ні чытаў, ёсць *беларус* — сын едынаго, суцэльнаго беларускаго народу. Будзем гэтак працаваць, пакуль хопіць сіл. А як настане такі дзень, што прыйдзецца ці зусім закрыць газэту, ці друкаваць яе толькі адными літэрамі, тады ўжо не павінна паміж сьведомымі беларусамі быць ніякай споркі аб шрыфт: той шрыфт каторы трэба выбраць, будзе называцца ужо ня рускім, *а беларускім.*

**І. М—скі.**

*) Глядзі №№ 4, 6, 7 і 8 „Н. Н.“.

---

## З газэт.

„*Przegląd Wileński*“ у стацьці „*Nieporozumienie*“ (№ 19) закрануў вельмі цікавую справу, аб каторай нам хочэцца пару слоў сказаць. У гэтай стацьці чытаем:

> „У месцох с польскім, або ад вякоў апалячэным насяленьнем, а так сама з насяленьнем, каторае ясна цягнець да польскай культуры, уселякіе пробы будзіць беларускую ці літоўскую сьведомасць — гэта работа, праціўная дэмократызму, бо яна задзержывае поступ культуры і робіць нацыонал стычную закваску“.

Ведама кожнаму, што бадай усе *несьвядомые* беларусы-каталікі „цягнуць да польскай культуры“, бо так пакіравалася іх жыцьцё, што і ў касьцелі прыходзіцца ім чуць польскую мову, і самі моляцца папольску Дык вось і падыймаецца пытаньне: няўжо ж іх за гэта трэба запісаць у палякі? Няўжо-ж будзіць у іх беларускую сьведомасць — гэта грэх проці дэмократызму, і такую работу трэба пакінуць?

Праўдзівы дэмакрат, не задумываючыся нават, атказэ цьвёрда: не! Дэмократызм — гэта жаданьне збудзіць народ да жыцьця, дабіцца, каб ён свой голас даў, каб выказаў свае думкі, сваю душу. Найлягчэйшая дарога да гэтаго — развіваць *народную* культуру, карыстаючыся пры-

---

## Сусьветны жаніх. *)

„Карацей кажучы, Хвёдар выдаўся такім, якім яго і трэба было чэкаць, уважаючы на яго ўдачу і ранейшае жыцьцё. Адразу забраў ён усё у свае рукі: як іх саміх, так і ўсе іхніе скарбы. Піў гарэлку і сам блізка што саўсім нічога не рабіў; хадзіў па ігрышчах, а жонкай ды цешчай пануківаў, як валамі пад ярмом. Прабавалі некаторые с суседзёў дый мой Язэп гаварыць яму, навучаць, стыдзіць, але ён як рэзане ў атказ, дык адразу губу як глінай замажэ; толькі вушы абвянуць, і гукаць ужо далей нечэга. Так іх усе і адракліся. „Ну, вас к ляду; як зыйшліся, так і разбірайцеся! а то ешчэ ў чужым пахмельлю трэба галаве балець“.

„Сама Марьянка каб калі слаўцом прагукалася каму-небудзь с крыўдай на Хвёдара! Напроці, пры усякай гутарцы, як магá, старалася абгарадзіць яго, выбяліць усякі яго паступак. Хоць тое, што яна ўсё благое хавала ад людзей, відаць было на ей, як у люстры. Бо мала што не ад самаго вясельля з ей зрабілася вялікая перамена: прыціхла, бытцым у ваду апусьцілася. Саўсім і падабенства не стала с першай заўсягды рахманай, лёгкай і вясёлай Марьянкай. А дальш-больш: яна с пышнай, цьвітучай макаўкі зрабілася падобнай на сухую кветку.

„Гэтак прайшло больш году. У Марьянкі знайшоўся ўжо маленькі сынок. І з гэтаго часу, як казала сама Марьянка да сваей маткі, у яе бытцым адвалілася пьяўка ад сэрца, вочы прасьвятлелі, і яна бытцым праглянула ў даль на жыцьцё, убачыла мэту яго, каторай стаўся для яе маленькі сынок; ды толькі адным гэтым сынам адвадзіла душу, цешылася, а рэшта ўсё кругом сябе прапушчала міма вушэй і сэрца.

Раз неяк, здаецца, каля гэтай пары, — ды яно так і будзе, якраз перэд багатай куцьцёй, як цяпер помню! — захварэла Ганула, ды так злегла, як пласт у пасьцель; а і маленькі нешта занездаровіўся: крэкчыць, капрысіцца. Праз колькі дзён Ганулі так стала дрэнна, што ўжо не на жарты, — так і глядзі, каб ня зьмерла. І Марьянка прасі, малі Хведара зьездзіць хоць да хвэльчэра, а можэ-ж якую раду дасць — паможэ. Праўда, Хведар не таргаваўся доўга, а запрог кабылку і паехаў; гэта было так ешчэ у поўраньня, а пасьля поўдня, калі завярнула ліха, якраз вот, як сягоньня: сьвету Божаго не відаць! Мароз ешчэ паправіўся, хоць ты лысых лічы. Нашы мужчыны гэтак сама, як і сёлета, ездзілі ў заработкі; Якубу твайму тады было ешчэ гадоў чатырнаццаць. Яны толькі што прыехалі вечэрам і уселіся за вячэру, — а перамерзлі дык да костачэк, зуб на зуб не пападаець. Чуем: нехта хлом, хлом па дзядзінцу, бяжыць. „Ну, — голасна мы падумалі ўсе: ці ня Хведар там з сваімі бабамі расправіўся, бо больш у такую ліхату да нас некаму было бегчы, а пра Гануліно здароўе мы, прызнацца добра і ня ведалі — чулі толькі, што занездаровілося. І пры гэтым нас ахапіла нейкая трывога, — мы перэглянуліся, апусьцілі на стол лыжкі і проста затаіўшы дух пачалі чэкаць бегшаго па дзядзінцу. Разам дзьверы шпарка атчыняюцца, і ў хату с дзікім крыкам убегае Марьянка у аднэй маленькай хусьцінцы на галаве. Мы тут ужо бачым, што нешта не ладна, і з-застольля да яе: „што с табой? Ці ня Хведар?...“

„Ай — не! Родненькіе, памажыце мне! Міленькіе памажыце“, саўсім непрытомна крычэла Марьянка.

— „Дык што-ж с табой? — дапытываліся мы, — скажы“.

— „Мамачка мая міленькая, родненькая уміраець! Ай, додненькіе, пасьпешыце! Яна саўсім ужо канаець!“ — кідаючыся то к аднаму, то к другому, крычэла Марьянка. „А там-жэ нікога нет. Хведар паехаў па хвэльчэра і ешчэ не вярнуўся. Пойдзем, родненькіе, хутчэй, пойдзем!..“

„Мы тут з Язэпам схамянуліся, кінулі вячэру і, апрануўшыся на скорую руку, выбеглі с хаты. Марьянка уперад, а мы за ей па сьнягу. Падбегаем саўсім ужо да іхняго будынку і, хоць у мяцеліцу, але бачым: неякі конь стаіць запрэжэны каля хлявоў, ля плоту. Марьянка як бегла наперад, то, пэўна пазнаўшы сваю кабылку, хутка кінулася туды, чаго яна там? Мы астанавіліся. Аж разам, як нажом, прабіў нашэ сэрцэ крык Марьянкі: „Ой, ратуйце родненькіе! Ой, хутчэй сюды!“

„Нас гэтак аглушыў яе нежданы крык, што мы нейкі момэнт стаялі астаўбянеўшы, бытцым важучы, ці бегчы на ратунак, ці мó уцякаць самім. Але разам сарваліся з мейсца, ды да Марьянкі, а там: на санях ляжыць ніц чэлавек, блізка што саўсім завеяны сьнегам. Мы за яго, аж ён, як кол. Замёрз, значыць. Перэвярнулі яго, аж гэта Хведар абванітаваўшыся ўвесь, сморадом гарэлачным так і разіць. Што тут рабіць? Трэба як можна хутчэй яго ў хату, мó ешчэ адратаваць удасцца. Марьянка саўсім страціла прытомнасць: крычыць нешта недарэчнае, кідаецца,

*) Гл. № 18 „Н. Н.“.

роднай мовай народу, каторай ён змалку гаворыць дома, ў хаці, каторая вытварылася разам з усей яго асобеннай псыхікай, неразрыўна с тэй псыхікай звязана. Вось чаму адраджэньне народоў заўсягды ішло і ідзе поруч з дэмократызмам.

Само жыцьцё паказывае, што робіцца с „прышчэпкай“ чужой культуры, хаця бы народ і „цягнуўся“ да яе. Быў час, калі і польская і расейская інтэлігенція „афранцузіліся“: гукалі па французку, жылі культурным багацьцем, створэным французамі. Але гэты нездаровы час мінуўся без павароту: і расейскі, і польскі народ паказалі, што яны — жывые, што у іх ёсць даволі сіл, каб жыць ня крошкамі чужой культуры, а стварыць сваю.—Прыйдзе гэтак сама канец і „прыцягіваньню“ беларусоў-каталікоў да польшчыны, толькі дзеля гэтаго беларусы павінны стаць на работу ўсе, як адзін. А такая творчэская культуральная работа, зразумелая і блізкая усяму народу, ўсей массе, гэта і ёсць задача дэмократызму: *дэмос* (просты народ) тады пачне жыць сьведомым жыцьцём, пакіруе яго ў той бок, у які сам захочэ.

Так разумее задачу дэмократызму той, хто гэты вялікі і сьветлы ідэал ставіць вышэй за ўселякіе націоналізмы. З гэткай думкай выйшлі да працы першые сяўцы ў народзі беларускай сьведомасьці; яна-ж вядзе ўпярод і ўвесь сучасны беларускі рух.

І калі ад нас будуць вымагаць, каб мы прысталі на апалячываньне несьведомых беларусоў-каталікоў толькі затым, што яны бытцым-то „цягнуцца“ да польшчыны, мы адкажэм адно: *не дамо!* Не дамо, бо работа дзеля пашырэньня національнай сьведомасьці ў нашым народзі на ўсей старане ня толькі не задзержывае поступу культуры, а, наадварот, адна толькі і развівае яе. А калі што можэ спыніць яе развіцце, дык гэта прышчэпка чужой культуры, хаця бы тую прышчэпку рабілі *у імя „дэмократызму“*.

**Г. Б.**

## Выйдзі...

Ўстань ты, старонка, родная маці.
Годзе зімоваго рабскаго сну,
Годзе табе ўжо слёзна ўздыхаці,—
Выйдзі на поле, на сенажаці,
Выйдзі спаткаці вясну!

Скінь лахманы, што доўгіе векі
Ты валачыла с кастры, с палыну;
Выйдзі с пад дзікай зімняй апекі,
Што над табою строіла здзекі,—
Выйдзі спаткаці вясну!

Вырылі сьцюжы ўюгамі, сьнегам
Яму глыбоку табе не адну;
Сьнежные наспы мела начлегам...
Глянь, сьнягі таюць, рэчкі йдуць бегам...
Выйдзі спаткаці вясну!

С поўначы сівер кідаў табою,
Як абадрану з лісткоў галіну;
З захаду зьверы йшлі чэрадою
Рваць твае грудзі... Вышла жывою,
Выйдзі-ж спаткаці вясну.

Дзетак тваіх скрозь крыўдай сьляпілі,
Мучылі, гналі без часу ў труну,
Казак вучылі, што ты у магіле.
Толькі-ж блеск сонца здраду асіліў...
Выйдзі спаткаці вясну.

Ясна, сьвяточна ў красы ўбярыся,
Птушкай свабоднай сягні ў вышыну,
З сонцэм злучыся, зорамі йскрыся,
Песьняй распейся, славай акрыйся,
Выйдзі спаткаці вясну.

Сплецену с церняў маеш карону,
Хором твой—неба і нівы краса,
Царство ў чатыры дрэмле староны,
Слугі—мазольных рук міліёны...
Выйдзі... Чэкае весна...

**Янка Купала.**

Пецербург,
10/III—1912 г.

* * *

Дні ідуць за днямі,
І праходзяць годы,
А за намі сьледам
Ўсё ідуць нягоды.

Тчом мы павучыну
Радасьці і шчасьця,
А павее вецер
Холадам ненасьця,

І парвуцца ткані,
Разлятуцца прахам,
І прэд невядомым
Зноў стаім са страхам.

Знаць ужо с прадвеку
Гэтак і бывае:
Ліха ідзе з намі,
Шчасьце-ж уцекае.

**Якуб Колас.**

## Вечэр на берэгу возера.

Хвалі ціха плюскаталі,
Бытцым блюзьнілі у сьне;
Пырскі белые ўзлеталі
І знікалі ў глыбіне.
Больш і больш гусьцелі цені,
Вецер ціхі падступаў;
Змрок вячорны ў нейкай лені
Цэлы сьвет сабой абняў.
Лес як бытцым сплыў за горы;
Не дагледзіш дрэў і траў.
Замігцелі ў небі зоры,
Сон зямлю апанаваў.
Ціша мёртвая настала,—
Толькі возера ў тахт свой,
Як с прасоньня, марматало
І змагалось с цішыной.

**Я. Журба.**

## Незгараемые будынкі у Віленскай губэрніі.

Пры землеустраіцельнай камісіі ёсць інжэнер, колькі тэхнікоў і майстры, каторые паказываюць і вучаць новых хутарнікоў, як будаваць будоўлі, каторые не баяцца агня і не гніюць. Трэба, каб такіе хаты былі ня дорагі, падхадзілі да нашаго клімату і да быту беларускаго землероба. Будынкі можна рабіць: 1) (саманные) з цэглы, зробленпай з гліны з саломай і сушэнные на сонцы (10 вяршкоў, па 5 на $2\frac{1}{2}$), але яны за дорагі, 2) глінабітные, лепянкі па спосабу Неверовіча, пракладываецца у поперэк сьцяны, наускос сечэны хвораст, верес, салома; 3) робяць цэглы, з вапны з жвірам—штучные камяні, але гэта будзе каштаваць 14—20 руб. квадратны сажэнь, і хаты такіе трохі халодные. У 1912 г. маюць збудаваць на хутарох 108 песчанна-бетонных хат і 38 гліна-хворастных. Песчанна-бетонные былі апісаны у календары „Н. Н.“ за 1910 г.; жвір мешаецца з вапнай пакуль ня зробіцца чуць вільготны, ставіцца скрыня без дна на тое мейсцо і пясок гэты насыпаецца у форму і трамбуецца моцна, так сцена і нарастаець.

Незгараемые будоўлі шырацца, так, што нехватаець майстроў, каторых бяруць з Ноўгародзкай школы. Землеустраіцельная камісія хацела наняць 20 майстроў, але пакуль што іх німа адкуль узяць. Збіраюцца зрабіць школу незгараемых будынкоў у Вільні, на гэта трэба 60.000 руб. Можэ і школа аткрыецца, часць грошы дасць казна, а часць „распарадзіцельны камітэт“, каторы заместа земства у нас тут. Хутарнікам выдаецца ад казны пазычка да 300 руб. без працэнтоў, першые 5 гадоў нічога не плаціцца, а потым 10 гадоў па 30 руб. У Лідзкім павеці будуюцца 34 хутары, у вёсцы *Волковічах* гаспадар Богадзель зрабіў песчанна-вапенную хату 10 на 12 арш. за 175 руб. з страхой і печчу, але без падлогі, у м-ку *Васілішках* ксёндз Соколоўскі выбудаваў дом з вапны і пяску і накрыў такой самай дахоўкай. Той 18 на 24 аршына, абышоўся каля 8 руб. квадратны сажэнь сьцяны. У Троцкім Павеці у в. *Даўгах* 15 гаспапароў будуць рабіць незгараемые будынкі. У в. *Малевічах* каля м. Іліі Вілейск. пав. калі адзін гаспадар пабудаваў мазанкі з гліны, то за яго прыкладам усе пачалі так будаваць. У в. *Дайневе* Ашмян. пав ёсць мазанкі, што стаяць ужо 15 гадоў, цяпер мужыкі пераходзяць на хутары і ужо хочуць будаваць з вапны і пяску. У м. Княгініне Вілейск. пав. зрабілі краму мазанку, але адразу недаўшы прасохнуць атынкавалі, дык з гэтай прычыны вільготна. Пасьля пажароў у м. *Маладэчні* і *Красным* Вілейск пав. там найбольш будуюць мазанкі з гліны, або з вапны і пяску. Так што незгараемые будоўлі шырацца па краю.

**А.**

## З Беларусі і Літвы.

*(Ад уласных карэспандэнтоў).*

**Мінск.** Кажуць, што губэрнатар Эрдэлі у восень кінець Мінск. Некаторые блізкіе людзі, глаўные цяпер, па троху гатовяць сабе ціхіе спакойные куточкі. Адзін саветнік, што кватэраваў у губэрнатарскім доме, шукаець ужо кватэру, паліцмэйстэр купіў у Ігуменскім павеце маёнтак. Саветнік С. купіў на краю Мінска фальварак Людамонт...

*Мікола Камароўскі.*

**Рудзішкі,** Віленск. губ. троцк. пав. Тут было такое здарэньне: адна селянская семья назьбіраўшы смаршчкоў наварылі іх, ды перадтым, як варыць, гэтые веснавые

мітусіцца у розные бакі: то да хаты, то да нас, то схопіцца за Хведара, то ізноў пусьціцца да хаты с крыкам: „А там жэ мая мамачка уміраець! А мой сынок дарагі!“ Але не дабяжыць—вернецца.

Мы і самі саўсім палунелі. Кідаемся, хапаемся то за тое, то за сёе, а нічога не выходзіць. Помнім, што трэба як можна сьпешацца гэтаго чэлавека ратаваць ад сьмерці, а і там у хаці нет ведам, што з Гануляй дзеецца. Памкнуліся на кабылцы вязьці Хведара к хаці—кабылка ня йдзе: ня можэ сарваць з мейсца саней, тады мы хапіліся, думалі нясьці на руках, але цяжка, мне не пад сілу, а Язэп адзін ня можэ. Хацелі адблутаць кабылку, але ў пасьпяху, ды ў пацёмку ніяк толку не дабіліся. У канцы Язэп страціў цярпеньне і нечым калі ўцяў кабылку; тая ірванула са ўсіх жыл, нешта храснула, покнула, і кабылка аж на нос сунулася, сарваўшыся раптам з мейсца. Толькі падвозім Хведара да хаты, аж адтуль выбегае Марьянка і глухім, здушэным голасам прагукала:

— „Памёрла!“

„У нас апусьціліся рукі, астаўбянелі. Але у гэтым стаўбняку ня доўга прыйшлося быць нам. Перэд нашымі вачыма хутка развярнуўся ешчэ новы абразок: марьянка, выбегшы с хаты і сказаўшы, што матка памерла, тут-жэ, раптам, крыкнула і, як касой падсечэная, бац у сьнег і распласталася. А во, беда гаручая! Галовачкі нашы бедные!—Саўсім мы памешаліся, няведаем, што рабіць, за што хапацца. Грудзі нам здушыў ні то жаль, ні то страх, а сьлёзы так і коцяцца з вачэй; хочэцца крычаць, але бытцым нехта трымае за горла, ды і не даець. Бачу толькі, што Язэп, кінуўшы Хведара, падскочыў да Марьянкі; вось і я туды. Узялі мы яе, паднялі, аж яна, як павесма, толькі сьлінкі цякуць з губы. Мы так-сяк цераз парог перэцягнулі ў хату. Уцягнуўшы Марьянку ў хату, рынулі яе на землю і чуем: дзіця недзе слабенька плачэ, ці ўжо нават не плачэ, але чуць чутна неяк жаласна стогнець. Некалі нам было зварочываць увагі на яго, ці разгледацца, бо трэба было як можна сьпяшыць Хведара валачы ў хату. Выбегаем на дзядзінец, аж во, табе: кабылкі німа, а разам з ей і Хведара. Мы туды, сюды, аж яна забілася ў дзяньнік. Ах, каб цябе воўк зарэзаў! Хацелі звярнуцца с кабылкай, але нямошна; цесна было, дык, узяўшы на рукі, нясьлі Хведара праз увесь дзядзінец: яго такі лепш было нясьці, бо ён ужо быў каляны. Хата стаяла насьцеж, бо ў пасьпеху закруткі не закруцілі; вось дзьверы і расчыніліся. Хата была і без таго сьцюдзёная, хоць ваўкоў марозі, бо у Хведара ніколі людзкіх дроў не было, ды мусі і не агледжэная была на зіму; а цяпер стала саўсім, як пуня. Апрача гэтаго у ёй было блізка што саўсім цёмна, бо газьнічка мала сьветла давала. І хоць нам некалі было там размышляць аб чым-небудзь, але страшэнная ціш халадзіла душу.

Язэп, ані мінуты не марудзячы загаманіў на мяне, каб я бегла на вёску зваць людзей, а сам прыняўся, як ведаў ачучываць Марьянку. Збегліся людзі, і кожны, хто прыбегаў, стаўбянеў з упуду і дзіва, пакуль не загаманяць да яго, што не на вясельле прыйшоў стаяць, а ратаваць людзей ад сьмерці. Ды ўсе нашы стараньня напрасны былі, бо адратаваць ад сьмерці ніводнаго нам не удалося. Хапіліся кабеты дзіцяці і знайшлі яго канаючаго каля ложка на зямлі у аднэй кашульцы, з акраваўленай галоўкай,—пэўна разбіў, зваліўшыся з ложка, аб вострые вуглы палена, каторае лежало тут, а на ложку, на падушцы лежалі разасланые полачкі с паяском, прыгатоўленые да спавіваньня дзіцяці. Дзіцятка на руках скора і душу аддало“.

„Ох, мой ты Божухна!“—Язэпіха цяжка ўздыхнула і моўчкі апусціла галаву.

Маўчала і Зося. Апрвіўшыся ад цяжкаго ўражэньня, Язэпіха падняла галаву і загукала:

„Мая ты дачушка! я нават цяпер не магу успомніць, што мы тады перажылі. Асабліва мы з Язэпам. Мацнейшые характэрам мужчыны, упэўніўшыся, што ўсе чацьвёра ўжо ня жывы, злажылі ўсіх у радок пакуль што на падлозі, і мы усе, як адзін, апусьціліся на калені, каб памаліцца за іх душы Богу. У кожнаго, хто там быў і бачыў усё гэта, ня столькі ад жалю, сколькі ад болі сэрца каціліся сьлёзы, і вочы так і блудзілі з аднаго нябошчыка на другога; кожны азіраўся, ці не стаіць тут за плечамі гэта страшэнная сьмерць, ці не яна гэта такім холадам дыхаець... А на двары гэтак сама гудзела і шумела мяцеліца, як галодны зранены зьвер, абласаваны сьвежай крывёй...“

На надворку пачуўся гоман. Зося устала і, паглядзеўшы ў вакно, прагукала:

— „Вось і нашы прыехалі“.

І абедзьве кабеты сталі прыгатаўляць вячэру.

**К. Олехновіч-Чэркас.**

грыбы, у каторых паміж зморшчкамамі ёсць крэпкая атрута, добра не ачысьцілі, вось калі яны наеліся гэтых грыбоў, то усе пахварэлі. Сынок іх восьмігадовы хлапчук памер у скорым часе, а рэшта сямьі пакл..лі у бальніцу у Вільні.

*Свой.*

В. **Чэпурнішкі**, Рукойнскай вол., віленскаго павету. Кавалю з вёскі „Поцагрынь“ суседзі памагалі перавозіць хату у другую вёску. За тое ён іх пачаставаў гарэлкай і півам у мястэчку Рукойнях. Папьянаму прышло да спрэчкі і бітвы, с каторай сусед Ав.жэнь з вёскі Чэпурнішэк вышоў чуць жывы. ..в помніць толькі тое, што нехта даў яму піўной барылкай у плечы. Яго-ж па другі дзень нашлі у кустах пад Чэпурнішкамі с пабітай галавой і ўсяго у крыві. Ён нікога ні пазнаў ані сваіх дзяцей і усё праклінаў камароў, што яго абкусалі. Палежаўшы у бальніцы А. выздаравеў але да работы ня здольны. А бедная жонка з малымі дзяцьмі без ніякай віны павінны цярпець горэ, праз тое, што муж і бацька любіў хлебануць пры здарэньні.

Каліж гэткіе сумные здарэньня навучаць нашых селян цьвярозасці?

*М. П.*

**Лунна**, Гродз. губ. і пав. 25 красавіка у Лунні згарэло 7 мешчанскіх гумен. Пагода была сухая і ветрэная; ўсё шчасьце ў тым, што гумны гэтые стаялі с краю і вецер дуў у поле, а то было-б дрэнна ўсяму мястэчку, бо хоць пажарная дружына тут і ёсць, але яна нарыхтавана дрэнна—ніякаго парадку і послуху німа.

= Каля Лунны праходзіць Нёман; карыстаючы з гэтаго, скупшчыкі лесу прыганяюць многа дрэва з Мінскай і другіх губэрній да Лунны і тут яго дастаюць на берэг; строяць гумны, хаты, баты (баркі). Лесу каля нас мала, а хоць і ёсць, дык усё панскі; а пажары бываюць кожны дзень. вось селяне і купляюць на берэзі гатовые гумны, хаты, а купцы дзяруць, як за сваю скуру. На берэзі працуе многа народу-беларусоў. Німа што і казаць, што за свой крывавы мазоль яны дастаюць вельмі мала. Вось што я убачыў прыехаўшы у Лунну кірмашовым днём (у сераду). Народ толькі што стаў збірацца на кірмаш, і я пайшоў перш прывітацца з бацькам - Нёмнам. Дзень ясны, сонечны. Паром ідзе з аднаго берагу на другі; народу на ём многа. бачу: стаіць каля берагу колькі аграмадных батоў недакончэных, а каля аднаго народу чэлавек с семдзесят с каламі і крычаць: „раз раз, раз“... Падхаджу бліжэй. Спускаюць барку сажон 30—40 даўжыні на ваду. Калы трэшчаць і ўедаюцца ў плечы, а аграмадная барка ня хочэ лезьці ў ваду. Народ худы, бледны; старые і хлопцы напіраюць мацней... Адзін зацягівае маркотную песьню: „Разам хлопцы напірайце, барку ў воду вы спушчайце“ і далей, у часе перарыву, другіе падхватываюць і пры словах: „разам“ —плечы паднімаюць калы, а барка паволі сунецца ў ваду. Купец крыкрычыць, махае і рукамі і нагамі: „хлопцы, разам, ну, ну, ну“... Пытаюся у аднаго хлопца: „што вам за гэта плацяць?“—„А што?—па чарцы гарэлкі дасць!“ Аглядаюся назад, аж бачу (я яе сперш не прымеціў) стаіць кабета і трымае у кошычку колькі пляшэк гарэлкі... Вось чым плацяць, мой родны браце, за тваю крывавую працу!

*М. Арол.*

Г. **Горкі**, Могіл. губ. 3 траўня у нас аткрыўся летні тэатр, каторы пабудавала прыездная украінская труппа, супольна з вольнапажарнай дружынай. Ставілі „Цыганка Аза“. Нельга не радавацца з гэтай навінкі. Шкада што у Горках дагэтуль тутэйшые вучні не наладзілі хоць аднэй беларускай вечарынкі з беларускім тэатрам. Калісь вучні гарэцкай школы працавалі над беларускай мовай і літэратурай, ад іхняй працы захавалася, на жаль, усяго толькі адна памятка: поэма „Тарас на Парнасе“, а пэўне яны апрацавалі тады не адну і можэ важную рэч. Варта было-б, каб рупнейшые беларусы у Горках пашукалі у старых паперах - рукапісах ды па бібліотэках сьлядоў працы над беларускай лі-тэратурай беларускай студэнцкай группы с 1840-х гадоў, а можэ удалосяб аткрыць што і вельмі цікавае. 6 траўня быў у Горках „дзень белай кветкі“; за прадажу румянкоў сабралі каля 250 руб.; прадавалі кветкі дзеўчаты і кабеты з вучнямі землямерн. і аграноміч. школ і с чыноўнікамі гораду.

*Мікалай Мокры.*

## З усіх старон.

**Пецербург**. С прычыны першаго мая у Пецербурзе баставало каля 200,000 работнікоў. Як пішэ правіцельственная газэта, работнікі Пуцілоўскіх фабрык, пакінуўшы работу, злучыліся з іншымі работнікамі і рушылі у горад. Выклікано былі конные жандармы, тагды работнікі разышліся. Пробавалі зрабіць дэмонстранцію на Пецербургскай старане. Грамада з Александроўскаго парку пайшла, сьпеваючы, да Дваранскай вуліцы, але паліція разагнала дэмонстрантоў.

Каля 3 ч. дня с Пецербурскай стараны па Ліцейным праспэкці народ сунуўся на Неўскі пр. Паліція заступіла дарогу. Сталася стычка ў часе, каторай акалодачнаго зранілі камянэм у галаву. Дэмонстранты пайшлі па Неўскі. Надыйшла ешчэ паліція і разагнала іх. Было ешчэ колькі цроб зрабіць дэмонстранцію.

У звязку с першым мая перэтрасьлі каля 150 душ студэнтоў і работнікоў, каля 80 душ арэштавалі.

**Кронштад**. У Пецербурзе ходзяць чуткі, што на некаторых ваенных караблёх ваеннаго флоту зрабіўся неспакой. Гэтые чуткі пайшлі с таго, што двадцаць з лішкам матросоў арэштавалі. „Н. Вр.“ пішэ, што даведаліся, бытцым з заграніцы перэвазілі транспорты нелегальнай літэратуры. Павязьлі яе сперша у Фінляндію, а посьле у Расею. Дужа шырыцца літэратура соціалістоў рэволюціонероў. Паміж матросамі Балтыцкаго флоту ішла прапаганда, каторай кіраваў камітэт з 2 расейцоў, 2 фінляндцоў і 1 эстонца. Адведаўшы Кронштад марскі міністр І. К. Грігоровіч выдаў найстрогшы указ зберэгаць ўсё у сэкрэці.

**Масква**. На ст. Перово баставало 1,300 работнікоў ж. д. майстэрэнь.

= Прамысловец Гінкель, перад сьмерцью адпісаў усё што меў сваім служачым, усяго блізка на 5 мільёноў рублёў. Тые цяпер закладаюць акціонернае таварыства і асыгнавалі на ўсякіе дабрачынные мэты 100 тысяч руб.

**Юзоўка**. Двое важных преступнікоў схаваліся у кватэры аднаго работніка і адтуль стрэлялі у паліцію. Паліція запаліла дом. Адзін праступнік і кабета с дзяцёнкам згарэлі, другі выскочыў і бачучы, што ня можна уцячы, застрэліўся. Забілі урадніка і двох паліцэйскіх. Зранілі 5 душ пастаронных.

**Варшава**. Павэдле афіціальных вестак першаго мая бастовало 2,300 душ.

**Одэсса**. С прычыны першаго мая баставало колькі тысяч работнікоў. На перэдодні многа перэтрасьлі і арэштавалі.

**Палтава**. У горадзі многа было обыскоў і арэштоў.

**Кацерынославу**. Закончылося сьледзтво на чугуначнай станціі. Выкрылі разстрату каля 200 тысяч рублёў. Колькі служачых пацягнулі пад суд.

**Краснаярск**. Судовая палата засудзіла на 4 гады у арэштанцкіе роты станавога прыстава, Гордіна, каторы распусціў 10 тысяч руб., выданых на харчы палітычным ссыльным.

**Чародны 21 нумэр выйдзе 24 мая с прыдаткам кніжкай.**

## Жарты.

**Хіба што так.**

Мужык даў жонцы (праўда, першы раз ешчэ) кулаком ў плечы.

— Кпіш, ці папраўдзі? вытарашчыўся, пытае жонка.

— Якіе тут кпіны—напраўду! атказывае муж.

— Хіба што так, бо я такіх жартоў ня люблю, кажэ, супакоіўшыся, жонка.

* * *

**Найлягчэйшая сьмерць**. Найлягчэйшая сьмерць на марозі: сядзеш, гэта сабе і ня чуеш, як засьнеш, а на заўтра глядзіш—ўжо і гатоў.

* * *

На сенажаці касіло двох мужыкоў, адзін кажэ да другога: —„Слухай, куме, вы вельмі разумны чэлавек, вы ўжо як людзі кажуць былі на кані і пад канём, у горадзі і за горадам, то вы шмат чаго ведаеце, чаму гэта адны кажуць Рым. а другіе Ерузалім?“

А кум кажэ так:

— „Бо ты дурны, адразу відаць, што ты ня быў у горадзі, я табе скажу чаму гэтак кажуць, бо бачыш па руску называецца Рым, а па польску Ерузалім.

* * *

— „Скажы мне, Вінцук, чаму ты гэтак нізка кланяешся гэтаму чэлавеку?

— „А таму, што ён мог і не ажаніўся з маей цёткай, пасьля каторай вялікіе грошы пойдуць для мяне.

Рэдактар-Выдавец

А. Ўласоў.

**Німа чым замяніць у сямьі СУХІ КВАС** і кіслы борщч з натуральнаго соладу. Аналіза № 9462.

Прыдум. **І. Д. Скворцов.**

*Адрэс: Масква, Сухоквас.*

Маю многа пісем, падзяк і наград. Пытайце безплатна прэйс-курант.

**Асьцерэгайцеся фальшэрства.**

3—2

**8-мы чародны кірмаш-выстаўка рожнай жывёлы**, коней, кароў, сьвіней, авечак і хатняй птушачай драбязы, **каторы устраівае камітэт гадоўлі жывёлы Віленскаго Сельска-Гаспадарскаго Таварыства, будзе у Вільні 22 і 23 мая г. г. на пляцу Селяска-Гаспадарскаго Таварыства, Завальная вуліца дом № 9.**

Цэна за мейсцо за 2 дні пад страхой ад штукі 3 руб; каля барьеры 1 руб; за штуку дробнай жывёла 50 кап., за клеткі для драбязы, павэдле умовы. Селянам, дробнымгаспадаром дарма.

Лепшые штукі будуць адзначэны, а за лепшые штуселянскай гадоўлі гаспадаром будуць выдавацца награды рознымі рэчамі.

Заяўленьня трэба прысылаць не пазьней 16 мая.

# „САХА“

## Першы беларускі месячнік сельскай гаспадаркі

Выйшла ужо другая кніжка.

«САХА» дае практычные рады па ўсіх аддзелах сельскай гаспадаркі, дастасаваные да нашых варункоў і клімату

**ПАДПІСНАЯ ЦЭНА:**

На 1 год . . . . . 1 руб. 20 кап.

на 6 месяцеў . . . — » 60 »

Цэна асобнаго нумэру 8 кап., з дастаўкай да хаты 10 кап.

**Пробны нумэр высылаецца дарма.**

*Адрэс рэдакції: Вільня, Завальная 7.*—Рэдактар-выдавец **А. Ўласоў.**

# „НАША НІВА“

**Гэта люстро душы, думак і патрэб Беларусі.**

У 1912 гаду усім гадавым і поўгадавым падпішчыкам Рэдакція разашле, як безплатны прыдатак, **„Беларускі Календар“ на 1912 год**, а у працягу году падпішчыкам разашлецца ешчэ колькі іншых цікавых і карыстных кніжак. Цэна с перэсылкай да хаты: на 1 год—2 р. 50 к., на 6 м. —1 р. 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 м.—25 к. За граніцай: на 1 год—4 р.,на 6 м.—2 р., на 3 м. 1 р.

. Друкарня Марціна Кухты, Татарская, д. № 20.